# Беларуская мова

## ДЛЯ ЎСТАНОЎ АДУКАЦЫІ З БЕЛАРУСКАЙ МОВАЙ НАВУЧАННЯ І ВЫХАВАННЯ

### І КЛАС

**Кантрольнае спісванне** (15—20 слоў)

**Вясной**

Наступіла вясна. Прыгрэла ласкавае сонейка. Пасвятлелі аблачыны на небе. Лёгкі ветрык лашчыць твар. Як хораша на вуліцы! (18 слоў)

*(Паводле В. Ткачова)*

**Настаўнік**

Дзеці гулялі ў настаўніка і вучня. Першакласнік Паўлік быў настаўнікам. Ён вучыў брацікa Глеба пісаць літары. Прыгожыя літары атрымаліся! (20 слоў)

**Новы сад**

Каля школы вучні вырашылі пасадзіць дрэвы. Бацькі купілі саджанцы. Дзеці дружна працавалі. Яны пасадзілі яблыні. Прыгожы будзе сад! (20 слоў)

### ІІ КЛАС

**Кантрольны дыктант** (35—40 слоў)

**Памочнік**

Летам Дзяніс жыў у вёсцы. Кожны дзень хлопчык дапамагаў сваёй бабулі. Ён насіў дровы ў хату, карміў курэй. Разам з сястрой Вольгай паліваў кветкі. Аднойчы нават карову даіў! Радавалася бабуля. Добры расце ў яе памочнік! (36 слоў)

*(Паводле У. Ліпскага)*

Паведаміць пра пастаноўку коскі ў сказе *Ён насіў дровы ў хату, карміў курэй.*

**Клапатлівая Ірына**

На дзень нараджэння Ірыне падарылі акварыум з рыбкамі. Кожны дзень дзяўчынка з цікавасцю назірае за рыбкамі. Яны вельмі прыгожыя! Ірына не забывае пакарміць рыбак. Раз на месяц дзяўчынка мяняе ў акварыуме ваду. Ёй дапамагае брат Віця. (38 слоў)

**Успаміны пра бабулю**

Мама расказала Ульяне пра жыццё бабулі. Аказалася, што бабуля была на вайне! Яна служыла ў арміі. Бабуля лячыла параненых салдат. Пасля вайны бабулю ўзнагародзілі медалём. Расказ мамы ўсхваляваў дзяўчынку. Ульяна доўга распытвала пра вайну і глядзела фатаграфіі. (40 слоў)

*(Паводле У. Ліпскага)*

Паведаміць пра пастаноўку коскі ў сказе *Аказалася, што бабуля была на вайне!*

## ДЛЯ ЎСТАНОЎ АДУКАЦЫІ З РУСКАЙ МОВАЙ НАВУЧАННЯ І ВЫХАВАННЯ

### ІІ КЛАС

**Кантрольны дыктант** (25—30 слоў)

**Медыцынская сястра**

Марыне надакучыла глядзець вясёлыя фільмы. Яна вырашыла перабраць шафу з цацкамі. Дзяўчынка прышыла лапу мядзведзю. Потым яна перавязала вуха зайчыку. Перабінтавала руку лялцы. Усіх вылечыла Марына! (28 слоў)

*(Паводле У. Ліпскага)*

**Цукеркі**

Першыя цукеркі прыдумалі старажытныя егіпцяне. Цукру ў той час яшчэ не было. Начынкай для цукерак служылі салодкія фінікі. Сапраўдныя цукеркі з'явіліся ў Францыі. Яны былі без шакаладу. (28 слоў)

*(Паводле М. Пазнякова)*

**Летам**

Мінулае лета Надзя правяла ў вёсцы. Разам з братам Ільёй бегалі па лузе. З бацькамі купаліся ў возеры. З дзядулем хадзілі ў лес па грыбы. Цудоўнае было лета! (29 слоў)

*(Паводле У. Ліпскага)*

## ДЛЯ ЎСТАНОЎ АДУКАЦЫІ З БЕЛАРУСКАЙ І РУСКАЙ МОВАМІ НАВУЧАННЯ І ВЫХАВАННЯ

### ІІІ КЛАС

**Кантрольны дыктант з дадатковым заданнем** (45—50 слоў)

**Сумная казка**

Настаўніца прапанавала дзецям скласці казку. Першым падняў руку Рыгорка. Хлопчык прыдумаў гісторыю пра дзівосную краіну. Ён трапіў у краіну на чароўным самалёце. Там заўсёды было цёпла,

раслі прыгожыя кветкі. У блакітных азёрах плавалі залатыя рыбкі. Аднак Рыгорку хутка стала сумна. У той краіне не было людзей. (48 слоў)

*(Паводле У. Ліпскага)*

Паведаміць пра пастаноўку коскі ў сказе *Там заўсёды было цёпла, раслі прыгожыя кветкі.*

***Дадатковае заданне***

1. Выпішыце з тэксту словы, супрацьлеглыя па значэнні прапанаваным.
*I варыянт:* весела — ________, апусціў — ________.
*II варыянт:* холадна — ________, апошнім — ________.
2. Разбярыце словы па саставе.
*I варыянт:* рыбкі
*II варыянт:* Рыгорка
3. Падкрэсліце галоўныя члены сказа.
*I варыянт:* У блакітных азёрах плавалі залатыя рыбкі.
*II варыянт:* Хлопчык прыдумаў гісторыю пра дзівосную краіну.

**Маленькая птушка**

Якая птушка самая маленькая ў Беларусі? Гэта жоўтагаловы каралёк. Людзі называюць яго яшчэ паўночным калібры. Важыць птушка каля пяці грамаў. Апярэнне ў каралька вельмі мяккае і пушыстае. На галаве ў птушкі жоўты або аранжавы чубок. Ён нагадвае сапраўдную карону. Дзякуючы ёй, птушка і атрымала сваю назву. (48 слоў)

*(Паводле В. Сахвона)*

Запісаць на дошцы слова *жоўтагаловы*.

Паведаміць пра пастаноўку коскі ў сказе *Дзякуючы ёй, птушка і атрымала сваю назву.*

***Дадатковае заданне***

1. Выпішыце з тэксту аднакаранёвае слова да прапанаванага. Абазначце ў словах корань.
*I варыянт:* пушок
*II варыянт:* птушыны
2. Знайдзіце ў сказе дзеяслоў, вызначце яго лік і час.
*I варыянт:* Людзі называюць яго яшчэ паўночным калібры.
*II варыянт:* Важыць птушка каля пяці грамаў.
3. Падкрэсліце галоўныя члены сказа.
*I варыянт:* Важыць птушка каля пяці грамаў.
*II варыянт:* Людзі называюць яго яшчэ паўночным калібры.

**Вагі**

Сёння амаль у любым прадуктовым магазіне ёсць вагі. Гэта прылада для ўзважвання прадметаў і рэчываў. Першыя вагі з'явіліся вельмі даўно. Канструкцыя іх была простай. Браўся каромысел з дзвюма чашамі. На адну чашу прадавец клаў тавар. На другую чашу ён ставіў гіры. Зараз самымі дакладнымі прызнаны лічбавыя вагі. (48 слоў)

*(Паводле А. Бадака)*

Запісаць на дошцы слова *дзвюма*.

***Дадатковае заданне***

1. Разбярыце слова па саставе.
*I варыянт:* лічбавыя
*II варыянт:* прадуктовым
2. Знайдзіце ў сказе дзеяслоў, вызначце яго лік і час.
*I варыянт:* На адну чашу прадавец клаў тавар.
*II варыянт:* Першыя вагі з'явіліся вельмі даўно.
3. Падкрэсліце галоўныя члены сказа.
*I варыянт:* Першыя вагі з'явіліся вельмі даўно.
*II варыянт:* На адну чашу прадавец клаў тавар.

**IV КЛАС**

**Кантрольны дыктант з дадатковым заданнем** (65—75 слоў)

**Мядзведзь**

Мядзведзь — лясная жывёла. Зімой гэты звер спіць у берлагу. Месца для логава мядзведзь падбірае старанна. Часцей за ўсё гэта глухі кут лесу. Бываюць і выключэнні. Мядзведзь можа ўладкавацца на спячку ў стозе сена. Часам звер зімуе ў вялікіх дуплах старых дрэў. Знешне бярлог нагадвае гняздо вялікай птушкі. Ён высцілаецца сухой травой, галінкамі. Залягае мішка ў бярлог заўсёды галавой да выхаду. Так лягчэй пакінуць бярлог вясной. (66 слоў)

*(Паводле І. Салавей)*

Запісаць на дошцы слова *старанна*.

Паведаміць пра пастаноўку працяжніка.

***Дадатковае заданне***

1. Падбярыце з тэксту антонімы да прапанаваных слоў.
*I варыянт:* уваход — ________, маладыя — ________
*II варыянт:* маленькая — ________, ніколі — ________
2. Знайдзіце ў сказе назоўнікі, вызначце іх склон.
*I варыянт:* Залягае мішка ў бярлог заўсёды галавой да выхаду.
*II варыянт:* Мядзведзь можа ўладкавацца на спячку ў стозе сена.
3. Падкрэсліце галоўныя члены сказа.
*I варыянт:* Часам звер зімуе ў вялікіх дуплах старых дрэў.
*II варыянт:* Залягае мішка ў бярлог заўсёды галавой да выхаду.

### Ульяна і чмель

Ульяна ахвотна ездзіць на дачу. Дзядуля называе яе дачніцай.

Аднойчы Ульяна палівала кветкі. Прысела каля іх і паіла з лейкі. Толькі панама віднелася з кусцікаў. Раптам Ульяна як закрычыць! Кінулася яна да дзядулі. Уся трымціць ад страху. Што здарылася?

Гэта чмель напалохаў дзяўчынку! Ён аблятаў кветкі і ўбачыў каляровую панаму. Вырашыў чмель, што гэта вялізны рамонак. Хацеў на ім нектару пашукаць. Толькі Ульяна адразу не зразумела! (69 слоў)

*(Паводле У. Ліпскага)*

Запісаць на дошцы слова *нектар*.

Паведаміць пра пастаноўку коскі ў сказе *Вырашыў чмель, што гэта вялізны рамонак.*

**_Дадатковае заданне_**

1. Выпішыце з тэксту сінонімы да прапанаваных слоў.
   *I варыянт:* спужаў — __________, немалы — __________
   *II варыянт:* калоціцца — __________, спачатку — __________
2. Знайдзіце ў сказе займеннік, вызначце яго лік, асобу і склон.
   *I варыянт:* Дзядуля называе яе дачніцай.
   *II варыянт:* Прысела каля іх і паіла з лейкі.
3. Падкрэсліце галоўныя члены сказа.
   *I варыянт:* Толькі Ульяна адразу не зразумела!
   *II варыянт:* Ульяна ахвотна ездзіць на дачу.

### Дажынкі

Дажынкі — старажытнае свята. Звязана яно з заканчэннем жніва. У гэты дзень людзі ладзілі абрады, танцавалі, спявалі. Жыта дажыналі гуртам. Жнеі ўпрыгожвалі апошні сноп кветкамі і стужкамі. Яны плялі вянкі з каласоў, палявых кветак. Потым з песнямі ішлі ў вёску. Жнеі перадавалі апошні сноп гаспадару. Ён запрашаў талаку за гасцінны стол. У кожнай сям'і на Дажынкі гатавалі шчодрае частаванне. На стол ставілі бліны з маслам, крупяную кашу. Людзі спадзяваліся на добры ўраджай у наступным годзе. (75 слоў)

*(Паводле А. Ліса)*

Запісаць на дошцы слова *Дажынкі*.

Паведаміць пра пастаноўку працяжніка.

**_Дадатковае заданне_**

1. Разбярыце словы па саставе.
   *I варыянт:* палявых
   *II варыянт:* крупяную
2. Знайдзіце ў сказе прыметнік, вызначце яго лік, род і склон.
   *I варыянт:* Жнеі перадавалі апошні сноп гаспадару.
   *II варыянт:* Ён запрашаў талаку за гасцінны стол.
3. Падкрэсліце галоўныя члены сказа.
   *I варыянт:* Яны плялі вянкі з каласоў, палявых кветак.
   *II варыянт:* Жнеі ўпрыгожвалі апошні сноп кветкамі і стужкамі.

**Спіс выкарыстаных крыніц**


1. Дамашнія рэчы / [аўтар тэксту А. Бадак ; мастак В. Дзятко]. — Мінск : Мастацкая літаратура, 2017. — 36 с.
2. Ліпскі, У. С. Сакрэты колераў вясёлкі : апавяданні, казкі, вершы / У. С. Ліпскі. — Мінск : Адукацыя і выхаванне, 2014. — 120 с.
3. Народны каляндар школьніка : тэматычны зборнік мастацкіх твораў / уклад. П. Грынчанкі. — Мінск : Мастацкая літаратура, 2018. — 159 с.
4. Пазнякоў, М. П. Хто прыдумаў і калі? : з гісторыі тэхнікі, транспарту і рэчаў / М. П. Пазнякоў. — Мінск : Коларград, 2017. — 100 с.
5. Салавей, І. А. Буры гаспадар лясоў : для малод. шк. узросту / І. А. Салавей. — Мінск : Беларуская Энцыклапедыя імя Петруся Броўкі, 2017. — 32 с.
6. Сахвон, В. В. Птушыны калейдаскоп : для малод. шк. узросту / В. В. Сахвон. — Мінск : Беларуская Энцыклапедыя імя Петруся Броўкі, 2017. — 32 с.
7. Ткачоў, В. Ю. Незвычайны дыктант : апавяданні : для малод. шк. узросту / В. Ю. Ткачоў. — Мінск : Мастацкая літаратура, 2004. — 47 с.



**Н. М. АНТАНОВІЧ,**
дацэнт кафедры беларускага і рускага мовазнаўства факультэта пачатковай адукацыі БДПУ імя М. Танка, кандыдат педагагічных навук, дацэнт